Картка 2

*Дайце сваю назву апавяданню «Зямля блакітных рэк і азёр». Падумайце над варыянтамі назваў асноўных пытанняў, якія былі разгледжаны на ўроку. Запішыце ў табліцу.*

| Тэма. Зямля блакітных рэк і азёр | Тэма. ________ |
|---|---|
| 1. Водныя шляхі Беларусі | 1. |
| 2. Незвычайная рака | 2. |
| 3. Таямніцы возера Свіцязь | 3. |

адкрыцці падчас экскурсій і падарожжаў, чытання легенд і паданняў, адпаведнай гістарычнай літаратуры (кнігі дэманструюцца).

Вывучэнне сённяшняй тэмы дае нам магчымасць паразважаць над наступнымі пытаннямі:

1. У чым, на ваш погляд, значэнне воднага шляху «з варагаў у грэкі»? *(Развіваўся гандаль, умацоўваліся сувязі з іншымі краінамі.)*

2. Паразважайце, ці можа быць рака-вуліца ў сучасным горадзе. (Можна параўнаць з горадам Венецыяй.)

3. Ці могуць паданні мець гістарычную каштоўнасць? *(Могуць, калі сярод звестак выбраць сапраўдныя.)*

**VIII. Інфармаванне аб дамашнім заданні.**

Настаўнік прапануе (па жаданні) выканаць краязнаўчае заданне і падрыхтаваць паведамленне пра раку або возера, якія знаходзяцца паблізу свайго населенага пункта.

Вучэбны дапаможнік, с. 15–20, с. 21, з. 2 (падабраць (па жаданні) паэтычныя або музычныя творы ў якасці прыкладу для адказу).

Атлас, с. 1, 5.

Контурная карта, с. 5, з. 5, 7.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Хрэстаматыя для пазакласнага чытання ў 2–4 класах : дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання / уклад. В. І. Гапанёнак. — Мінск : Сэр-Віт, 2015. — 272 с. — (Школьная праграма).
2. *Шаўлоўская, М.* Роднае слова : падруч. для 3-га кл. шк. з бел. мовай навучання / Марыя Шаўлоўская, Мікола Мішчанчук. — Мінск : Нар. асвета, 2001. — 246 с.
3. *Бутрамееў, У.* Вялікія і славутыя людзі зямлі беларускай : для мал. і сяр. шк. ўзросту / У. Бутрамееў ; маст. М. Рыжы. — 4-е выд. — Мінск : БелЭН, 2005. — 128 с. : іл.
4. *Паноў, С. В.* Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь. 4 клас. Дыдактычныя і даягнастычныя матэрыялы : дапаможнік для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С. В. Паноў. — Мінск : Аверсэв, 2018. — (Серыя «Кампетэнтнасны падыход»).
5. *Вольскі, А. В., Гімпель, І. А.* Буслянка : падручнік па літаратурнаму чытанню для 2-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. мовай навучання. — 2-е выд. — Мінск : Асар, 2000. — 304 с. ; іл.
6. Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку (з электронным дадаткам) / аўт. суправаджальнага тэксту, склад.: Н. Г. Ваніна, Л. Ф. Кузняцова, В.І. Цірынава. — Мінск : Пачатковая школа», 2018.



***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага моваазнаўства факультэта пачатковай адукацыі*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*


# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі

## II клас*

### *Подзвіг*

*1. Расшыфруйце і запішыце слоўнікавае слова.*

| 2 | 4 | 5 | 1 | 7 | 6 | 3 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| о | з | в | п | г | і | д |

*Падкрэсліце ў слове літару, правапіс якой трэба правяраць. Вусна падбярыце праверачнае слова.*

*2. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам. Устаўце ў слова прапушчаную літару.*

Беларусы не забываюць __________ г..рояў Вялікай Айчыннай вайны.

*3. Якія літары «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

д | дз | дзь

по..віг

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

*4. Прачытайце тэкст. Устаўце прапушчаныя літары ў словы.*

Г_рой — гэта адважны чалавек, які здзейсніў по_віг. Не дзеля сябе, а дзеля людзей. Дзеля нас з табой. Але г_роем можа быць і цэлы горад. Як наша сталіца — горад-г_рой Мінск. І крэпасць — як Брэсцкая крэпасць-г_рой.

*Віктар Кажура* [1, с. 6]

## *Радзіма*

*1. Разблытайце «павуціну» і запішыце слоўнікавае слова.*




*Пастаўце націск у слове.*

*2. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

**Малюнак**

Аблачынкі, сонца круг,
а пад імі — рэчка, луг...
І паставіў подпіс Дзіма:
«Гэта ўсё — мая ________!»

*Раіса Баравікова* [2, с. 15]

*3. Дапоўніце радок слоў блізкім па значэнні слоўнікавым словам.*

Айчына, Бацька..шчына, __________ .

*Устаўце патрэбную літару на месцы пропуску ў слове.*

*4. Прачытайце словы, якія «схаваліся» ў слоўнікавым слове. Выкарыстайце белыя клеткі-падказкі. Запішыце словы.*

| Р | а | д | з | і | м | а |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |

*5. Дапоўніце вершаваныя радкі слоўнікавым словам.*

Мы любім прасторы ____________ сваёй,
І сонца, і зоры над роднай зямлёй.

*Ніна Галіноўская* [3, с. 32]

*6. Дапоўніце верш слоўнікавым словам.*

Асветнік, вучоны
І першадрукар,
Наш гонар —
Францішак Скарына.
Запомні ўсім сэрцам
Як велічны дар
__________ы
Славутага сына.

*Міхась Пазнякоў* [4, с. 24]

***Асве́тнік** — той, хто пашырае веды.*

*Раскажыце, што вы ведаеце пра Францыска Скарыну.*

## *Свята*

*1. Закрэсліце літару, якая сустракаецца часцей за астатнія.*

С Ь В Ь Я Ь Т Ь А

*Запішыце слова, якое атрымалася. Пастаўце націск у слове.*

*2. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

**Падарунак**

Сёння ________ ў нашай хаце,
рады тата, я і брат.
Падарыў дзед нашай маці
новы фотаапарат.

*Уладзімір Мацвеенка* [5, с. 33]

*3. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.*

| | |
|---|---|
| Урачысты дзень у памяць якой-небудзь выдатнай падзеі — гэта __________________. | *святочны* |
| Урачыста адзначаць які-небудзь знамянальны дзень — гэта значыць __________. | *святкаваць* |
| Прыбраны, прыгожы, не будны — гэта значыць ________________. | *свята* |

*4. Дапоўніце прыказку слоўнікавым словам. Калі так гавораць?*

Будзе і на нашай вуліцы _________.

*5. Разгадайце рэбус. Запішыце слова, якое ў вас атрымалася.*

М = В

С



мята

*Падзяліце слова на склады.*

*6. Дапоўніце верш патрэбнымі словамі.*

Пракаціўся гулкі гром — сыпнулі ___________,
Дзіўна-казачным агнём ажылі травінкі.
___________ танцуе па двары радасна-заўзята.
Першы дожджык дзетвары — вунь якое ______!

*Віктар Кажура* [1, с. 24]

***Заўзя́та** — з захапленнем.*

***Словы для даведкі:** свята, дождж, дажджынкі.*

*7. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

Э-ге-гей, дарогу дайце!
Санкі коцяцца з гары!
Хто з вас смелы? Даганяйце!
Будзе ________ дзетвары!

*Віктар Кажура* [1, с. 34]

*У слоўнікавым слове падкрэсліце літары, якія абазначаюць звычныя гукі.*

## Спектакль

*1. Расшыфруйце і запішыце слоўнікавае слова.*

| 3 | 2 | 1 | 4 | 6 | 5 | 8 | 9 | 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| е | п | с | к | а | т | л | ь | к |

*Падзяліце яго рыскай (|) на склады.*

*2. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

і  я  е

сп..ктакль

*Пастаўце націск у слове. Падкрэсліце першы склад перад націскам.*

*3. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*

Пастаноўка, паказ п'есы — гэта __________.

*4. Прачытайце тэкст. Дапішыце прапушчаныя літары ў словы.*

Беларускі дзяржаўны т_атр лялек знаходзіцца ў Мінску. Гэта старэйшы лялечны т_атр рэспублікі. У рэпертуары т_атра — сп_ктаклі для дзяцей.

*5. Дапоўніце афішу патрэбнымі словамі.*

Беларускі рэспубліканскі __________
юнага гледача

Афіша

26 сакавіка запрашаем на _______________ «Дзюймовачка».

Пачатак _____________ — 10:30.


**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Кажура, В. В.* Маленькая азбука вялікай краіны : для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту / В. В. Кажура. — Мінск : Пачатковая школа. — 2019. — 36 с.
2. Вясёлка, 2011. — № 6. — С. 15.
3. *Галіноўская, Н. В.* Калі я шчаслівы : вершы, казкі, жарты, небыліцы : для дзяцей мал. шк. узросту / Н. В. Галіноўская ; маст. Галіна Хінка-Янушкевіч. — Мінск : Звязда, 2013. — 160 с.
4. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні: азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / Міхась Пазнякоў ; маст. Марыся Лось. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.
5. *Мацвеенка, У. І.* Займальны родны алфавіт : вершы, загадкі, скорагаворкі : для мал. шк. узросту / Уладзімір Мацвеенка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 48 с.

**Крыніцы ілюстрацый** https://img.hunkercdn.com/630x/cpie/images/a05/7p/t0/use-peppermint-rid-fleas-800x800.jpg.



## *Уважаемые педагоги! Приглашаем вас к сотрудничеству!*

*Делитесь опытом с коллегами: присылайте в редакцию как готовые статьи, так и свои наработки — мы поможем оформить их в материалы для публикации. Звоните, присылайте свои материалы по электронной почте.*

***Телефон:*** (8017) 297-93-20. ***Электронный адрес:*** aiv-pn@tut.by

**Общие требования к отправляемым материалам**

**Оформление письма.**

В теме электронного письма следует указать:

- для научной статьи — слово **Статья**.
- для методических рекомендаций, разработки воспитательного материала — слово **Методика** или **Мероприятие**;
- для разработки урока — слово **Урок**, название учебного предмета, класс, тему урока, номер урока в соответствии с примерным календарно-тематическим планированием (учебник/год выпуска).

**Сведения об авторе.**

На первой странице каждого файла должны содержаться сведения об авторе:

- фамилия, имя и отчество; место работы (учёбы), занимаемая должность, учёная степень, учёное звание или квалификационная категория; контактные телефоны (мобильный и домашний); домашний и служебный адреса (с индексом);
- ***паспортные данные:*** гражданство, серия, номер паспорта, дата и место выдачи, личный номер, адрес регистрации.

**Таблицы, рисунки, схемы, фотографии**, содержащиеся в тексте, следует ***пронумеровать***, а в тексте сделать сноски на соответствующие номера.

При **цитировании стихов** необходимо указать автора и сделать ссылку на ***номер источника*** (книги, электронного ресурса), содержащегося в отдельном списке в конце материала.